View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



*В.М. ХАДАНЁНАК*

# ПРАБЛЕМА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ РУСКАЙ АРМІІ ФУРАЖОМ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Анализируется процесс обеспечения русской армии фуражом в период Первой мировой войны. Особое внимание уделяется статистическим источникам. Делается вывод об основных проблемах, возникших во время сенозаготовок и перевозки фуража.

The process of provision of russian army with fodder during the World War the 1st is analyzed. Special attention is paid to the statistic sources. The conclusion of the main problems appeared during the haying and fodder transportation is drawn.

У гады Першай сусветнай вайны надзвычай надзённа стаяла пытанне забеспячэння арміі фуражом. Ад яго якасці і своечасовасці пастаўкі ў раёны баявых дзеянняў часта залежаў зыход ваенных аперацый.

Беларускія прыфрантавыя губерні (Віцебская, Магілёўская, часткова Мінская) у найбольшай меры зазналі на сабе ўвесь цяжар фуражных нарыхтовак. Гэта пры тым, што корму для коней, якія знаходзіліся на палях баталій, заўсёды не хапала. У цыркуляры, які даслала Міністэрства харчу з Петраграда ў Віцебскі губернскі харчовы камітэт, чытаем: «Пагрузка сена для арміі ўпала да 35 % ад прызначанага нарада і ў гэтай норме праходзіць ужо другі месяц… Жахлівы стан, які назіраецца за ўказаны перыяд 1917 г. і асабліва ў 1915 г., калі ў выніку недахопу фуражу коням былі скормлены саламяныя дахі пабудоў і калі, нягледзячы на ўсе меры, падзёж коней дасягнуў велізарных памераў…»[1] Пераважная большасць тэлеграм на імя загадчыка па нарыхтоўцы сена ў Віцебскай губерні Зейна была наступнага зместу: «Коні арміі гінуць ад недаядання. Патрабую неадкладнай узмоцненай адпраўкі сена на фронт. Невыкананне патрабавання пацягне за сабою ліквідацыю фронту і гібель краіны»[2].

Не лепш былі справы з кормам скаціны, якая знаходзілася па адваротны бок ад лініі фронту. Калі на кожнага «артылерыйскага каня, згодна з загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, трэба было выдаваць па 15 фунтаў сена ці яравой саломы, а на астатніх коней па 10 фунтаў сена ці яравой саломы»[3], то для патрэб гаспадаркі на неакупаванай тэрыторыі Віцебскім губернскім харчовым камітэтам 2 верасня 1917 г. былі ўстаноўлены наступныя гадавыя нормы запасаў сена і саломы:

«Для каня старэй за 1 год – 180 пудоў сена і 70 пудоў азімай саломы; для каня маладзей за 1 год – 100 пудоў сена і 40 пудоў азімай саломы; для каровы старэй за 1 год – 140 пудоў сена і 80 пудоў яравой саломы і 70 пудоў азімай; для цяляці маладзей за 1 год – 80 пудоў сена і 50 пудоў яравой саломы і 50 пудоў азімай; для авечкі, казы – 40 пудоў сена і 20 пудоў яравой саломы і 20 пудоў азімай саломы»[4].

Для коней, якія былі занятыя на прасавальных апаратах, аддзел нарыхтовак устанавіў наступны рацыён: «Да 30 фунтаў сена і 5 фунтаў канцэнтраванага корму на суткі»[5].

Як бачна, забеспячэнне харчам жывёлы было ў надзвычай дрэнным стане. Да таго ж усе лішкі корму рэквізаваліся. Як ставіліся сяляне да падобных «аперацый», можна зразумець па таму факту, што рэквізіцыйным камісіям давалася ў дапамогу «50 чалавек узброенай каманды і 5 чалавек конных для сувязі»[6]. Прычым рэквізаваўся не толькі фураж, але і прасавальныя апараты, скаціна, падводы. Адбывалася гэта згодна з загадам міністра харчу ад 12 ліпеня 1917 г. за № 13: «Губернскім (абласным) ці па іх даручэнні павятовым і валасным харчовым органам надаецца права ладзіць рэквізіцыі прэсаў, прасавальнага ці ўвязачнага дроту, вагаў, брызентаў ці іншага інвентару, неабходнага пры правядзенні вытворчых работ па нарыхтоўцы сена і саломы, а таксама і памяшканняў для прасавання і захоўвання гэтых прадуктаў»[7]. Па рэквізіцыі буйной рагатай жывёлы ў Віцебскім павеце быў складзены падрабязны план (табл. 1)[8].

Табліца 1

**Маршрут правядзення рэквізіцыі буйной рагатай жывёлы па Віцебскаму павету для патрэб войска**

| Назва воласці | Колькасць галоў, неабходных для рэквізіцыі | Час, прызначаны для правядзення рэквізіцыі | Пункт згону і прыёмкі рэквізаванай скаціны |
|---|---|---|---|
| Мішкаўская | 137 | 30 лістапада – 1 снежня | г. Віцебск |
| Вярхоўская | 80 | 2 снежня | г. Віцебск |
| Шчарбінская | 112 | 3 снежня | г. Віцебск |
| Сялюцкая | 120 | 4 снежня | г. Віцебск |
| Бабініцкая і частка Курынскай | 133 | 5 і 6 снежня | г. Віцебск |
| Жарабыцкая | 142 | 7 і 8 снежня | ст. Сіроціна |
| Лясковіцкая | 74 | 9 снежня | ст. Сіроціна |
| Старасельская | 91 | 10 снежня | ст. Сіроціна |
| Храпавіцкая | 114 | 12 снежня | ст. Лосвіда |
| Лосвідская | 82 | 13 снежня | ст. Лосвіда |
| Курынская | 209 | 14 снежня | ст. Лосвіда |
| Веляшкоўская | 232 | 16 і 17 снежня | ст. Лёзна |
| Каралеўская | 231 | 18 і 19 снежня | ст. Лёзна |
| Янавіцкая | 150 | 21 і 22 снежня | м. Янавічы |
| Вымнянская | 100 | 23 і 24 снежня | м. Янавічы |

Табліца 2

**Неабходная колькасць рабочых, коней, прыёмшчыкаў і арцельшчыкаў для правядзення сенанарыхтовак**

| Назва паветаў | Неабходная колькасць | | | |
|---|---|---|---|---|
| | рабочых | коней | прыёмшчыкаў | арцельшчыкаў |
| Віцебскі | 48 | 14 | 5 | 6 |
| Веліжскі | 96 | 19 | 7 | 7 |
| Гарадоцкі | 64 | 19 | 4 | 6 |
| Дрысенскі | 56 | 12 | 3 | 3 |
| Лепельскі | 60 | 24 | 4 | 5 |
| Люцынскі | 32 | 29 | 5 | 6 |
| Невельскі | 68 | 14 | 4 | 5 |
| Полацкі | 36 | – | 4 | 4 |
| Рэжыцкі | 32 | 29 | 5 | 5 |
| Себежскі | 44 | 14 | 3 | 3 |
| Усяго | 536 | 174 | 43 | 50 |

Вельмі негатыўна на працэс сенанарыхтовак паўплываў яшчэ і той факт, што напачатку імі было дазволена займацца выключна «агентам Губернскага харчовага камітэта і мясцовым грамадскім органам – павятовым і валасным харчовым камітэтам»[9]. Даверу гэтым арганізацыям мясцовае насельніцтва не аказвала, бо вельмі часта фураж закупляўся імі па заніжаных цэнах. Усялякі ж удзел «падрадчыкаў прыватных камісіянераў»[10] быў строга забаронены. Урадавыя органы рэзка выказваліся супраць нарыхтоўкі сена асобнымі вайсковымі часцямі, бо яны давалі насельніцтву больш высокую плату, чым Губернскі харчовы камітэт.

Пэўныя праблемы складваліся яшчэ і праз нерэальнасць планавых паказчыкаў, якія зусім не адпавядалі сапраўднаму стану рэчаў. Да прыкладу прывядзём наступныя статыстычныя звесткі.

На 13 ліпеня 1917 г. у Віцебскай губерні мелася нарыхтаванага і непагружанага сена: Віцебскі павет – 10 000 пудоў; Веліжскі – 40 000 пудоў; Полацкі – 6000 пудоў; Дрысенскі – 5000 пудоў; Невельскі – 16 000 пудоў; Гарадоцкі – 6000 пудоў.

Меркавалася ж да канца кампаніі па дадзеных паветах сабраць: Віцебскі павет – 200 000 пудоў; Веліжскі – 300 000 пудоў; Полацкі – 150 000 пудоў; Дрысенскі – 200 000 пудоў; Невельскі – 200 000 пудоў; Гарадоцкі – 200 000 пудоў.

Усяго па Віцебскай губерні: 2 250 000 пудоў[11]. Як бачна, планавыя паказчыкі былі надзвычай завышаны. А Вярхоўнае Галоўнакамандаванне ўводзілася ў зман лёгкавеснымі абяцанкамі.

Да таго ж на вёсцы ў часы ваеннага ліхалецця проста катастрафічна не хапала працоўных рук. З 1914 па верасень 1917 г. з сельскай мясцовасці Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў пад ружжо было пастаўлена 634 тыс. чал.[12] Пераважная большасць сялянскіх гаспадарак мела вострую патрэбу ў працоўных руках. Апроч мабілізацыі на фронт, сяляне працавалі яшчэ на розных работах: ахова чыгуначнага палатна і тэлеграфных ліній, праца па ўзвядзенню абарончых і фартыфікацыйных збудаванняў, рамонт дарог і мастоў, перавозка казённых грузаў і вайсковага рыштунку. Як следства, гаспадарак без працаздольнай мужчынскай сілы налічвалася ў 1917 г. у Віцебскай губерні 32,5 %, а ў Мінскай – 30,1 %[13].

Прычым ажыццяўляць некаторыя аперацыі (прасаванне сена) якасна маглі толькі кваліфікаваныя рабочыя. Таму сход загадчыкаў па нарыхтоўцы сена «катэгарычна выказаўся за неабходнасць арганізацыі пастаянных кадраў прэсоўшчыкаў і ўзбудзіў хадайніцтва аб водпуску неабходнай колькасці ваеннапалонных або вайсковых каманд (з разліку па чатыры чалавекі на кожны ручны і конны прэс)»[14].

Патрэбы паветаў Віцебскай губерні ў рабочых, прыёмшчыках, арцельшчыках, конях на сярэдзіну ліпеня 1917 г. прадстаўлены ў табл. 2[15].

Дадзеная сітуацыя была характэрна для ўсіх неакупаваных немцамі тэрыторый беларускіх губерняў. Зважаючы на гэтае становішча, з'езд прадстаўнікоў Губернскіх харчовых камітэтаў, які праходзіў у Маскве, прыняў наступную пастанову:

«Даць адтэрміноўкі па прызыву ў армію наступным катэгорыям служачых у арганізацыях і ўвогуле працуючых па нарыхтоўцы сена для войска і насельніцтва:

а) раённым загадчыкам і іх памагатым;

б) загадчыкам прасавальных пунктаў і іх памагатым;

в) тэхнікам па прыёмцы і адпраўцы сена;

г) бухгалтарам, сакратарам і загадчыкам справаводства;

д) прасавальшчыкам;

е) пастаянным возчыкам, якія заключылі дамовы на перавозку;

ж) і, па пастановах Губернскіх харчовых камітэтаў, пастаўшчыкам сена.

Хадайнічаць пра вяртанне з войска ўсіх аграномаў і тэхнікаў, незалежна ад адукацыйнага цэнзу і пасады, якую яны займалі на ваеннай службе»[16].

Існавалі і значныя праблемы з тэхнічным забеспячэннем нарыхтовачных пунктаў. Асабліва адчуваўся недахоп ручных і конных прэсаў, якія амаль цалкам належалі прыватным асобам. Таму нарада Міністэрства харчу лічыла неабходным «надаць загадчыкам (сенанарыхтоўчых пунктаў) права рэквізіцыі ўсіх ручных сенных прэсаў, якія ёсць у павеце, так ці іначай мяркуючы, што ўладальнікі прэсаў у арэнду іх не здадуць і будзе вялікі перапынак у нарыхтоўцы сена, і будзе страчаны самы зручны для прасавання час»[17].

Табліца 3

**Патрэба паветаў Віцебскай губерні ў брызентах**

| Назва паветаў | Маецца брызентаў у наяўнасці | Патрабуецца яшчэ |
|---|---|---|
| Віцебскі | 5 | 5 |
| Веліжскі | 10 | 30 |
| Гарадоцкі | 3 | 10 |
| Дрысенскі | – | 10 |
| Лепельскі | 3 | 12 |
| Невельскі | 5 | 7 |
| Полацкі | 3 | 7 |
| Рэжыцкі | – | 20 |
| Себежскі | 6 | 10 |
| Люцынскі | 3 | 20 |
| Усяго | 38 | 131 |

Яшчэ горш былі справы з падвозкай фуражу на станцыі і прыстані. Як сведчыць выпіска з нарады загадчыкаў па нарыхтоўцы сена ад 12–13 ліпеня 1917 г., «мясцовае насельніцтва зусім адмаўляецца ад дастаўкі сена ці патрабуе неймаверна высокіх цэн»[18]. Найбольш цяжка было знайсці падводы ў Віцебскім павеце. Валасным харчовым управам была дадзена наступная інструкцыя: «...карыстаючыся сваім аўтарытэтам, запэўніць насельніцтва і пераканаць яго ў неабходнасці пастаўкі сена для арміі, прыняць усе меры дзеля таго, каб насельніцтва даставіла закупленае і спрасаванае сена да станцый і прыстаней»[19].

Часам здараліся і выпадкі, калі нарыхтаванае сена доўгі тэрмін ляжала пад адкрытым небам і псавалася ад дажджоў. Таму адчувалася пільная патрэба не толькі ў складскіх памяшканнях адпаведных памераў, але і ў брызенце, аб чым сведчыць табл. 3[20].

Справа сенанарыхтовак для арміі ўскладнялася яшчэ і тым, што фураж быў шырока запатрабаваны і грамадскімі арганізацыямі, якія працавалі на карысць фронту. Так, на льнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» працавала 27 коней, на лесапільным заводзе Дзвінскага ваенна-акруговага кватэрнага ўпраўлення – 70 і г. д. Нават Губернская земская лячэбніца мела патрэбу ў сене для 2 коней і для набіўкі сеннікоў і падушак для псіхічна хворых. Сена і фураж, якія пастаўляліся ў грамадскія ўстановы і арганізацыі, зазвычай былі значна горшай якасці, чым тыя, якія ішлі на фронт. З Лужаснянскага ніжэйшага сельскагаспадарчага вучылішча ў аддзел нарыхтовак Віцебскай губернскай управы прыйшла скарга наступнага зместу: «Сёння дастаўлена ад с. Неналтоўскага 40 пудоў “канюшыны” 2-га гатунку, як значыцца ў квітанцыі. Не жадаючы браць на сябе нават маральную адказнасць, паведамляем, што гэта не канюшына, а гной, які ані коні, ані каровы не кранаюць. Карміць такім кормам скаціну, ад якой чакаецца малако, немагчыма. Корм не падыходзіць і для падтрымкі жыцця самых галодных жывёл»[21].

Да таго ж даволі цяжка было мясцоваму насельніцтву трымаць пастаянны псіхалагічны ціск з боку ўрадавых органаў, якія ўвесь час патрабавалі неадкладнага павелічэння нарыхтоўкі фуражу, даючы народу пустыя абяцанні. Напрыклад, прывядзём тэкст ліста, дасланага загадчыкам па нарыхтоўцы сена ў Віцебскай губерні: «Армія даядае апошнія крохі. Пачаўся масавы мор коней. Маюцца пэўныя ўказанні, што, калі ў самым бліжэйшым будучым арміі не будуць забяспечаны харчам і фуражом, салдаты пакінуць фронт і натоўпы галодных, дэмаралізаваных людзей, нішчачы ўсё на сваім шляху, хлынуць у глыб краіны. Праз геаграфічнае становішча насельніцтву Віцебскай губерні ў першую чаргу прыйдзецца зазнаць на сабе ўвесь кашмар і жах нашэсця галоднага натоўпу. Калі нават вытворчыя губерні пранікнуцца ўрэшце рэшт усведамленнем абавязку перад арміяй і павязуць харчаванне да станцый дзеля адпраўкі на фронт, на падвоз харчу і фуражу з поўдня спатрэбіцца больш ці менш працяглы час. Аднак армія не можа чакаць ніводнага дня. Аддзелу нарыхтовак вядома, што Віцебская губерня не можа надоўга забяспечыць фронт харчам і фуражом, але карміць армію на працягу аднаго – двух тыдняў, да падвозу хлеба і фуражу з поўдня, губерня ў стане. Калі мы зараз дадзім фронту перажаыць гэткія цяжкія часы, фронт і Расія не забудуцца на нас і падтрымаюць у цяжкую хвіліну. Грамадзяне, памятайце, што за натоўпамі галодных салдат ідуць ворагі нашы – немцы. Вашы жонкі і сёстры знаходзяцца ў смяротнай небяспецы. Гэта не словы – гэта жахлівая голая праўда»[22].

Як бачна, увесь цяжар па забеспячэнню арміі харчам і фуражом лёг менавіта на прыфрантавыя губерні. Губерні ж Цэнтральнай Расіі не аказвалі на гэтым кірунку істотнай дапамогі. Тэлеграма з Петраграда паведамляла: «Падвоз харчу і зернефуражу з унутраных губерняў амаль спыніўся. Шмат губерняў не атрымалі нават нарадаў. Звярніцеся з заклікам да насельніцтва падзяліцца з арміяй апошнім сваім хлебам»[23].

У сваім цывільным жыцці насельніцтва беларускіх неакупаваных губерняў вымушана было прытрымлівацца пастановы Часовага ўраду ад 25 сакавіка 1917 г., а менавіта: былі забаронены ўсе прыватныя здзелкі па гандлю хлебам, га-

раджане маглі мець запасы прадуктаў, неабходныя толькі для пракармлення членаў сваёй сям'і (не болей за 30 фунтаў мукі рознай і 3 фунтаў крупы рознай у месяц на 1 едака). Усе хлебныя запасы прыватных прадпрымальнікаў пераводзіліся пад апеку Губернскага харчовага камітэта.

За невыкананне дадзеных пастаноў «вінаватыя падвяргаюцца адказнасці па арт. 29 (…турэмнае зняволенне тэрмінам да 1 года і 6 месяцаў)»[24].

Такім чынам, на прыкладзе неакупаваных беларускіх губерняў даволі яскрава бачна, якія цяжкасці меліся па нарыхтоўцы харчу і фуражу, як востра не хапала працоўных рук і кваліфікаваных кадраў, тэхнічнага абсталявання, памяшканняў для захоўвання сена. Асабліва цярпелі ў гэтым плане прыфрантавыя беларускія губерні (Віцебская, Магілёўская, частка Мінскай). Да таго ж на іх пашыралася і дзеянне выключных законаў у харчовай галіне, якія надзвычай ускладнялі жыццё мясцовага насельніцтва.

[1] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 39.
[2] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 2. Л. 94.
[3] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 37.
[4] Там жа. Спр. 1. Л. 50 адв.
[5] Там жа. Спр. 1. Л. 51.
[6] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 2. Л. 105.
[7] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 17 адв.
[8] Гл.: ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 3. Л. 104.
[9] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 5.
[10] Там жа. Спр. 1. Л. 5.
[11] Там жа. Спр. 1. Л. 4 адв., 5 адв.
[12] Гл.: Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абезгаўз, Х.Ю. Бейлькін, А.Р. Бухавец і інш.; Пад рэд. В.П. Панюціча. Мн., 2002.
[13] Там жа С. 420.
[14] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 6 адв.
[15] Там жа. Спр. 1. Л. 7, 9.
[16] Там жа. Спр. 1. Л. 11.
[17] Там жа. Спр. 1. Л. 9 адв.
[18] Там жа. Спр. 1. Л. 4 адв.
[19] Там жа. Спр. 1. Л. 5.
[20] Там жа. Спр. 1. Л. 8.
[21] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 3. Л. 59.
[22] ДАВВ. Ф. 5. Воп. 6. Спр. 1. Л. 83.
[23] Там жа. Спр. 1. Л. 84.
[24] Там жа. Спр. 1. Л. 1, 1 адв.

Паступіў у рэдакцыю 28.06.10.

***Віктар Мамертавіч Хаданёнак*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу У.К. Коршук.